УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ ДЗЕЯЧАЎ ТЭАТРА І КІНО
# 1992–2005

**ФОНД № 376**

**ВОПІС № 2**

**1935–1992, коп. за 1928 – [1950-я] гг.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 2 ф. 376**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ Н.М. ГЕЙЦ | 1-19 | 1-4 |
| 1.1. | ФОТАЗДЫМКІ Н.М. ГЕЙЦ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ІМЯ Я. КУПАЛЫ | 1-11 | 1-2 |
| 1.2. | ВІНШАВАЛЬНЫЯ ПАШТОЎКІ ДА Н.М. ГЕЙЦ І ЯЕ МУЖА, АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.М. ГЕЙЦ | 12-15 | 2-3 |
| 1.3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.М. ГЕЙЦ | 16-22 | 3-4 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ М.А. ГУЛЕГІНАЙ | 23-30 | 4-5 |
| 3. | ПЕРАПІСКА І.М. ДАБРАЛЮБАВА І К.Т. МАЗУРАВА | 31 | 5 |

# Прадмова

У выніку навукова-тэхнічнага апісання быў складзены вопіс № 2 у колькасці 31 справа (129 дакументаў) за 1935–1992, коп. за 1928 – [1950-я] гады, якія паступілі ў БДАМЛМ у 1992–2005 гадах. Вопіс складаецца з 3 раздзелаў, сістэматызаваных па алфавіце прозвішчаў фондаўтваральнікаў, унутры раздзелаў – адпаведна прынятай у БДАМЛМ схемы.

Першы раздзел – дакументы актрысы Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы **Гейц Ніны Мікалаеўны**[1], якія паступілі ў БДАМЛМ ад Таццяны Іванаўны Гурэцкай (дачкі) у 2005 годзе. Раздзел складаецца з трох падраздзелаў: "Фотаздымкі Н.М. Гейц у ролях і сцэнах з спектакляў Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы" (справы сістэматызаваны па храналогіі), "Віншавальных паштовак да Н.М. Гейц і яе мужа, асабістых дакументаў Н.М. Гейц" (справы складзены па намінальна-храналагічным прынцыпе) і "Выяўленчыя дакументы Н.М. Гейц" (справы прадстаўлены двумя блокамі – фота Н.М. Гейц і фота іншых асоб – і сістэматызаваны па храналогіі) за 1935–1981, коп. за 1928 – [1950-я] гг.

Другі раздзел – дакументы артысткі оперы (сапрана) **Гулегінай Марыі Агасаўны** (дзявочае – **Мейтарджя́н**, у першым шлюбе – **Мурадзян**), якія паступілі ў БДАМЛМ ад Наталлі Фёдараўны Браславец (маці) у 1992 годзе. М.А. Гулегіна нарадзілася 9 жніўня 1959 года ў Адэсе (Украіна). У 1975 годзе паступіла на дырыжорскае аддзяленне Адэскага музычнага вучылішча (цяпер – Адэскі спецыялізаваны каледж мастацтваў імя К.Ф. Данькевіча), праз год была залічана на кафедру спеваў да А.В. Джамагарцян у Адэскую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В. Няжданавай (цяпер – Адэская нацыянальная музычная акадэмія імя А.В. Няжданавай). У 1983 годзе па запрашэнні народнай артысткі СССР С.В. Данілюк стала салісткай Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР (цяпер – Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь), дзе выканала партыі Аіды і Лізаветы ("Аіда" і "Дон Карлас" Дж. Вердзі), Разіны ("Севільскі цырульнік" Дж. Расіні), Іаланты і Таццяны ("Іаланта" і "Яўген Анегін" П.І. Чайкоўскага) і інш. Адначасова выкладала на кафедры спеваў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага (цяпер – Беларуская акадэмія музыкі). Выступала на сцэнах Венскай дзяржаўнай оперы (Аўстрыя), Метраполітан-опера (ЗША), Цюрыхскага опернага тэатра (Швейцарыя) і інш. з партыямі Амеліі і Лукрэцыі ("Баль-маскарад" і "Двое Фаскары" Дж. Вердзі), Тоскі ("Тоска" Дж. Пучыні) і інш. З 1987 года да сёння – салістка опернага тэатра "Ла Скала" (Італія).

У 1984 годзе заняла першае месца на Міжнародным конкурсе вакалістаў імя М.І. Глінкі ў Ерэване (Арменія), у 1985 годзе атрымала Гран-пры на сусветным конкурсе вакалістаў у Рыо-дэ-Жанейра (Бразілія), у 1987 годзе – званне "Заслужаная артыстка БССР", у 2003 годзе – "Народная артыстка Рэспублікі Паўночная Асецція – Аланія".

---

[1] Біяграфічныя звесткі гл. у прадмове да Воп. № 1, С. 1–2.

Дакументы М.А. Гулегінай сістэматызаваны па відах, унутры відаў – па храналогіі за 1984–1992 гады.

Трэці раздзел прадстаўлены перапіскай кінарэжысёра, народнага артыста БССР **Дабралюбава Ігара Міхайлавіча** з савецкім партыйным і дзяржаўным дзеячам **Мазуравым Кірылам Трафімавічам** падчас здымкаў фільма "Мама, я жыв". Асабісты архіў К.Т. Мазурава паступіў у БДАМЛМ у 1996 годзе ад Яніны Станіславаўны Мазуравай (удавы). У 2000 годзе як няпрофільны (рашэнне ЭМК БДАМЛМ № 11 ад 7 верасня 2007 года) ён быў перададзены ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь; перапіска, як профільная, была далучана да Ф. 376 "Збор дакументаў дзеячаў тэатра і кіно". Лісты ў ёй сістэматызаваны па алфавіце прозвішчаў, унутры – па храналогіі за 1984–1985 гады.

Прадмову склала
Заг. аддзела В.Ф. Шаталава
29.05.2024

Установа “Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва”

ЗАЦВЕРДЖАНА

ФОНД № 376
ВОПІС № 2
1935–1992, коп. за 1928 – [1950-я] гг.

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 11.06.2024
№ 7

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ Н.М. ГЕЙЦ** | | | | |
| | **1.1. ФОТАЗДЫМКІ Н.М. ГЕЙЦ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ІМЯ Я. КУПАЛЫ** | | | | |
| 1 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Як яе завуць" БДТ-1, пастаўленага рэж. Л.М. Літвінавым па п'есе М.А. Адуева, з удзелам Н.М. Гейц (у неўстаноўленай ролі) і В.У. Галіны, І.Ф. Ждановіч, П.А. Пекура, З.К. Скачкоўскай і інш. (у неўстаноўленых ролях) | 1936 | 1 | 1 | |
| 2 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Мілы чалавек" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. І.М. Маеўскім паводле камедыі К. Крапівы, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Аўдоцці Карпаўны), Г.П. Глебава (у ролі Язвы), З.Ф. Стомы (у ролі Сцяпана Андрэевіча) і інш. | 1945 | 1 | 1 | |
| 3 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Паўлінка" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. Л.М. Літвінавым па п'есе Я. Купалы, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Альжбеты), Б.А. Дакальскай [у ролі Паўлінкі], В.М. Полы (у ролі Агаты), М.Г. Захарэвіч, З.П. Зубковай, Я.А. Кавалёвай і інш. (у неўстаноўленых ролях) | [др. 1940-х - 1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| 4 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Маладая гвардыя" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. Л.М. Літвінавым паводле рамана А.А. Фадзеева, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Маці Любы Шаўцовай) і А.В. Рынковіч (у ролі Любы Шаўцовай) | 1947 | 1 | 1 | |
| 5 | Фотаздымкі Н.М. Гейц у ролі Няні Фядоссі ("Апошнія" М. Горкага, рэж. М.А. Зораў), сыгранай у Беларускім дзяржаўным тэатры імя Я. Купалы, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Н.М. Гейц і В.У. Галіны (у ролі Соф'і) | 1948 | 3 | 2 | |
| 6 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Жаніцьба Бальзамінава" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. Т. Гагавай па п'есе | 1951 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | А.М. Астроўскага, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Паўлы Пятроўны Бальзамінавай, удавы) і М.М. Зінкевіч (у ролі Матроны, кухаркі) | | | | |
| 7 | Фотаздымкі Н.М. Гейц у ролі Сіньёры Мантэкі ("Рамэо і Джульета" У. Шэкспіра, рэж. Л.М. Літвінаў), сыгранай у Беларускім дзяржаўным тэатры імя Я. Купалы, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Н.М. Гейц, М.М. Зінкевіч (у неўстаноўленай ролі) і інш. | 1951 | 2 | 2 | |
| 8 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Вечная крыніца" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. К.М. Саннікавым па п'есе Д.І. Зорына, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Анісіі) і У.Т. Кін-Камінскага і Г.К. Макаравай (у неўстаноўленых ролях) | 1957 | 1 | 1 | |
| 9 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Злавацца не трэба" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. К.М. Саннікавым па п'есе В.А. Зуба, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Акуліны, суседкі), Т.С. Бабко (у ролі Нюшы, работніцы сталовай), Г.С. Ваксман (у ролі Насці, бухгалтара сталовай), У.І. Дзядзюшкі (у ролі Ягора Шабуневіча), П.І. Іванова (у ролі Івана Анісавіча, дырэктара буфета сталовых і рэстаранаў) і інш. | 1960 | 1 | 1 | |
| 10 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Мільён за ўсмешку" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. З.І. Браварскай па п'есе А.У. Сафронава, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Феафілаты Понціеўны Падушкінай), М.Г. Захарэвіч (у ролі Ніны Фаміной), Б.У. Уладамірскага (у ролі Яўгена Міхайлавіча Бабкіна) і інш. | [1960] | 1 | 1 | |
| 11 | Фотаздымак сцэны з спектакля "Любоў, Надзея, Вера…" Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы, пастаўленага рэж. К.М. Саннікавым па п'есе П. Васілеўскага, з удзелам Н.М. Гейц (у ролі Акуліны) і В.П. Тарасава (у ролі Жоры Цуканава) | 1962 | 1 | 1 | |
| | **1.2. ВІНШАВАЛЬНЫЯ ПАШТОЎКІ ДА Н.М. ГЕЙЦ І ЯЕ МУЖА, АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.М. ГЕЙЦ** | | | | |
| 12 | Віншавальныя паштоўкі У.І. Уладамірскага на яго фотакартках да Н.М. Гейц і І.Ф. Гурэцкага (мужа) | 1958 | 2 | 2 | |

***

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 13 | Працоўная (з запісамі за 1932-1979 гады) і пенсійная (з запісамі за 1971-1983 гады) кніжкі Н.М. Гейц.<br>Паведамленне аддзела сацыяльнага забеспячэння Мінскага гарадскога савета народных дэпутатаў аб павышэнні Н.М. Гейц памера персанальнай пенсіі (1983) | | 16 | 3 | |
| 14 | Пасведчанні да медалёў і значка "Ветэран працы", "За працоўную адзнаку", "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг." і інш. на імя Н.М. Гейц | 1946-1977 | 11 | 5 | |
| 15 | Запрашальныя білеты Беларускага тэатральнага аб'яднання, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і Савета Дома работнікаў мастацтва на юбілейныя вечары І.Ф. Ждановіч і Б.У. Эрына на імя Н.М. Гейц | 1966-1981 | 5 | 3 | |
| | **1.3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Н.М. ГЕЙЦ** | | | | |
| 16 | Фотаздымак Н.М. Гейц у групе з іншымі выпускнікамі 2-х Мінскіх агульнаадукацыйных курсаў: Вандай Дунэль-Меркулавай, Сімай Кнігай, Асяй Федаровіч і інш.<br>Копія | коп. за 1928 г. | 1 | 1 | |
| 17 | Фотаздымкі Н.М. Гейц з І.Ф. Гурэцкім (мужам) з дароўнымі надпісамі Н.М. Гейц "Бабушке, Лиде и Александру Леонидовичу" і "Сестёнкам Лиде и Наде" ад 20 студзеня і 1 лютага 1935 года | | 2 | 2 | |
| 18 | Фотаздымкі Н.М. Гейц з іншымі акцёрамі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы: А.А. Бараноўскім, С.С. Бірылам, Г.П. Глебавым, Г.Ю. Грыгонісам, Б.А. Дакальскай, У.І. Дзядзюшкам, М.М. Зінкевіч і інш. падчас эвакуацыі ў Томску, гастроляў у Польшчы, Расіі і ва Украіне.<br>Арыгіналы і копіі | 1942-1961, коп. за 1940 г. | 10 | 10 | |
| 19 | Фотаздымкі Н.М. Гейц з іншымі акцёрамі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы: Т.Н. Аляксеевай, У.У. Былінскім, Л.М. Давідовіч, Б.А. Дакальскай, І.Ф. Ждановіч, М.М. Зінкевіч, Я.А. Кавалёвай, Г.К. Макаравай і інш. пасля спектакляў "Мілы чалавек" і "Рамэо і Джульета" і інш. (у т.л. групавы фотаздымак калектыву тэатра 1960 года).<br>Арыгіналы і копіі | [пач. 1940-х гг.] - 1960, коп. за 1945 г. | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 20 | Фотаздымкі акцёраў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы: В.У. Галіны, Б.А. Дакальскай, Г.К. Макаравай, І.Л. Ржэцкай, У.І. Уладамірскага, Л.П. Шынко і інш. з іх дароўнымі надпісамі Н.М. Гейц ад 1945 г. да 1974 г. | | 13 | 7/12 | |
| 21 | Фотаздымкі акцёраў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы: Т.Н. Аляксеевай, С.С. Бірылы, З.І. Браварскай, Л.С. Драздовай, І.Ф. Ждановіч, Б.К. Кудраўцава, Б.В. Платонава, Б.У. Уладамірскага і інш. у ролях і/ці ў сцэнах з спектакляў "За тых, хто ў моры" Б.А. Лаўрэнёва, "Канстанцін Заслонаў" А. Маўзона і інш. | 1946 - [1950-я гг.] | 15 | 15 | |
| 22 | Фотаздымкі дырэктара (Ф.Я. Адлер), акцёраў (С.С. Бірылы, К.Ф. Быліча, В.У. Галіны, Б.В. Платонава, З.Ф. Стомы, У.І. Уладамірскага і інш.) і тэхнічнага персанала (у т.л. І.Ф. Гурэцкага, мужа Н.М. Гейц) Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, індывідуальныя і ў групах, і інш.<br>Арыгіналы, копіі і ксеракопія | 1953-1963, коп. за 1942 - [1950-я гг.] | 11 | 11 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ М.А. ГУЛЕГІНАЙ** | | | | |
| 23 | Фотаздымак М.А. Гулегінай у час выканання арыі з оперы "Тоска" Дж. Пучыні, пастаўленай у оперным тэатры "Ла Скала" (Італія), з яе аўтографам.<br>Фотаздымкі М.А. Гулегінай у ролях і сцэнах з неўстаноўленых оперных спектакляў | [ад 1987 г.] - 1989 | 5 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 24 | Запрашальныя білеты Клуба сяброў оперы і Рэспубліканскага дома работнікаў мастацтваў Беларускага тэатральнага аб'яднання на канцэрт і творчую сустрэчу з М.А. Гулегінай.<br>Праграма дабрачыннага канцэрта М.А. Гулегінай на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь | 1985-1992 | 8 | 3 | |
| 25 | Афіша, праграмы канцэртаў і оперных спектакляў "Тоска" Дж. Пучыні, "Яўген Анегін" П.І. Чайкоўскага і інш. Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, Метраполітан-опера (ЗША), опернага тэатра "Ла Скала" (Італія), Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі (Расія) і інш. з удзелам | 1985-1991 | 37 | 17 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | М.А. Гулегінай.<br>Арыгіналы і ксеракопіі, выразка з друкаванага выдання | | | | |
| 26 | Грамата Цэнтральнага камітэта ЛКСМ Беларусі М.А. Гулегінай "за высокія творчыя дасягненні, актыўную прапаганду беларускага оперна-балетнага мастацтва сярод моладзі".<br>Ксеракопія | 1986 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 27 | Інтэрв'ю М.А. Гулегінай карэспандэнтам газет "Вечерний Минск", "Звязда", "Работніца і сялянка", часопіса "Музыкальная жизнь" і інш.<br>Выразкі з перыядычных выданняў | 1984-1992 | 10 | 8 | |
| 28 | Нататка, фотанарыс і фотарэпартажы пра М.А. Гулегіну.<br>Выразкі з газет і часопіса | 1987-1992 | 4 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 29 | Фотапартрэты М.А. Гулегінай.<br>Фотаздымак М.А. Гулегінай на ўваходзе ў Адэскую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В. Няжданавай.<br>Арыгінал і выразкі з друкаваных выданняў | [1983]-1990 | 4 | 3 | |
| 30 | Насценны каляндар на 1990 год з фотапартрэтам заслужанай артысткі БССР М.А. Гулегінай | | 1 | 1 | |
| | **3. ПЕРАПІСКА І.М. ДАБРАЛЮБАВА І К.Т. МАЗУРАВА** | | | | |
| 31 | Перапіска І.М. Дабралюбава і К.Т. Мазурава (Масква) у перыяд здымкаў фільма "Мама, я жив".<br>На Лл. 9-10 - працоўнае пагадненне паміж кінастудыяй "Беларусьфільм" і К.Т. Мазуравым аб кансультаванні апошнім здымачнай групы фільма "Мама, я жив" (1985) | 1984-1985 | 13 | 10 | |

У дадзены вопіс унесена 31 (трыццаць адзін)

спраў з № 1 па № 31 , 129 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонду зрабіла:
Загадчык аддзела ______________ В.Ф. Шаталава
07.07.2024

Дакументы прыняла:
Загадчык аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў ______________ В.І. Бярэйшык